## *У нядзелю — Дзень чыгуначніка*

# Брыгадзір

ЗДАРОЎЯ, шчасця, ладу ды згоды ў сям'і жадае калегам з нагоды Дня чыгуначніка **Анатоль Антановіч**. А тады пераходзіць на сваё, прафесійнае: "Каб на чыгунцы не было аварый".

Пасада Анатоля Браніслававіча называецца досыць мудрагеліста: "брыгадзір пуці вызвалены чыгуначнага транспарту і метрапалітэнаў". У метро, праўда, не працаваў, а вось бяспецы чыгуначнага руху на Маладзечанскай дыстанцыі пуці карэнны княгінінец аддаў ужо чвэрць стагоддзя. Прыйшоў сюды манцёрам пуці 2-га разраду, сакрэты нялёгкай працы пуцейца спасцігаў пад кіраўніцтвам брыгадзіра **Мар'яна Валковіча**. З таго часу набраўся вопыту, на добрым рахунку ў кіраўніцтва. І цяжка падлічыць, колькі разоў ужо сам быў настаўнікам для чыгуначнікаў-пачаткоўцаў. Шляхам Анатоля Браніслававіча пайшоў яго старэйшы сын Ігар — хоць і атрымаў у БНТУ прафесію інжынера па аўтамабільным транспарце, сёння працуе на чыгунцы.

Праца пуцейца забяспечвае досыць высокі ўзровень жыцця. Але лёгкай яе не назавеш: трэба і цярпенне мець, і сілу прыкласці. Дождж ці снег, мароз ці гарачыня — нясуць сваю няпростую службу на чыгунцы людзі ў аранжавых камізэльках.

— Ці параіце моладзі справу пуцейца? — пытаюся ў Анатоля Браніслававіча.

— Параю. Але адразу варта настроіцца, што тут трэба працаваць. Калі, яшчэ нічога толкам не ведаючы і не ўмеючы, прэтэндуеш на вялікі заробак — у пуцейцах дакладна не затрымаешся. Лёгкіх грошай нідзе не бывае, і на чыгунцы ў тым ліку.

**Наталля ЛІСІЦКАЯ.**

**Фота аўтара.**

